Уладзімір Саўчук

Мой вырай

Праграмная Рада Тыднёвіка „Ніва"
Беласток 2007

Рэдактар
Міра Лукша

Карэктура
Яўгенія Палоцкая

Тэхнічная рэдакцыя
Адам Паўлоўскі

Фота
Ганна Кандрацюк

Zrealizowano przy pomocy finansowej
Ministerstwa Spraw Wewnętrznych i Administracji

ISBN 978-83-917349-9-4

Copyright © 2007 by Rada Programowa Tygodnika „Niwa"

Друкарня
„Offset-Print", ul. Broniewskiego 14, Białystok

Мой рай

* * *

Адчуваеш свабоду размовы
лёгкасць слоў выяўляеш няспешна
хто пакінуў натхненне жыцця
след адвагі пяшчот непацешных,
зайшоў вечар у садок духмяны
месяц поўны прысеў за парогам
пакажы сваю мэту любові
хоць маленькі флірт перад Богам

Не суцешыш дарогі любоўю
не накорміш душы пацалункам
прага нішчыць супольныя мары
пакідае свой адрас у сэрцы
адлятае шчасце сляпое
уцякае збягае так хутка
як падзеліш на двое сумленне
родны кут ці адвечна Слабудка

Думка

Я тут,
сярод вялікіх машын,
будаўнічы новага заўтра
свайго горада Беластока.
Я тут, сярод усіх маладых,
што вучацца новага жыцця,
жыцця-чакання.
Я тут,
сярод тых,
што ўцяклі ў горад,
што зракліся вёскі,
не бачачы будучыні ў гаспадарцы.
А там
зямля вяжа дзень з ноччу,
рукі з плугам,
а па спіне ходзіць сыры вецер.
Я тут,
а думка мая ў маці:
„Трэба паехаць, памагчы, —
час садзіць бульбу”.

* * *

... калі бягу
то чую шар зямлі
як застывае пад нагамі
і адзываецца гадзіна
світання.
цяпер магу адважна сказаць:
— цячэ свабодна доўг жыцця
у гэты момант я сабою,
я стаў сабою сярод вас.

сёння ўсе супольна раім
багацце нашага Падляшша
і мне няўстыдна гаварыць
што гэта ёсць
Радзіма наша.

Божа мой! —
ці хтосьці нас наведаў?
— а дзе маё дзяцінства
мой след пакінуты
зямлі
цяпер,
тут лес расце
шумяць хваіны
а звонкі голас птушак
пляцецца між галіны

ой
дагадавала мяне маці.

Успаміны

Давайце вернемся ў гады
як Бог дзяцінства назначаў
каб не забыцца што тады
жыццё праводзілася інакш.

Давайце вернемся ў гады
тыя, як час быў малады
вецер гуляў у шчырым полі
спяваў нам песні пра нядолю.

Табун кароў, а я з кіёчкам
усе пазадзі ступаю ў след
ужо цяжкі ранак за мною
ці хопіць сілы на абед
туман падняўся ў прагоне
мая надзея ажывае
у ціхім полі льецца сонца
і жаўранак прыгожа ўжо спявае

вось на паперы запішу
няма другой такой гадзіны
бо не вернецца гэты час
хоць часта б'юцца ўспаміны.

У Нараўцы

У ціхім закутку зямлі
дзе Нарва шэпт свой пакідае
жывуць сапраўдныя сябры
ды мала хто пра гэта знае
вясны унійнай не баяцца
вядуць жыццё па ўсіх дарогах

законы тоеснасці нацыі
нясуць з малітваю да Бога
і вось такіх людзей нам трэба
з душою праўды і дабра
дзеля свайго чужое бачаць
сэрцам і зрокам серабра

назначыў Бог напрамак веры
малітву белых галубоў
нясуць яны спагаду свету
і моц запісаных там слоў.

Ліпень

На ўзгорку
спее збожжа сонцам
залацістым
захапілася душа
маляўнічым краявідам

глянуў у вырай
там жаўранак
абвяшчае свету
што
з нядзелі па Ільі
пойдзем жыта жаці.

Май

На небе ласкава міргаюць зарынкі
у рэчцы спакойна шурмоціць вада
на беразе ночы шукаю гадзіны
бо мала часу пакінулі мне

так ціха і лёгка танцуюць лісточкі
заносіўся вецер апоўначы лёг
не часта мы бачым дастойны рай Божы
бо мала часу пакінулі мне

глыбокая ноч утапіла і прагу
заснулі бярозы і ліпавы гай
спыніліся птушкі схаваліся пчолы
і мала часу пакінулі мне

з'явіўся світанак духмяны прыгожы
пахам вясны натхніў гэты дом
цяпер першым госцем дзядзькі Сярожы
бо мала часу пакінулі мне.

* * *

На вадзе разбурылася ноч
вецер рвецца і стогне ў лазіне
— ты за што цішыню так турбоціш
адрываеш злую хвіліну,
тут дарога імчыцца ў засвет
хвалі мнуцца маршчынай вады
князь вярнуўся з вялікай Варшавы
і пакінуў стымул да бяды
бо сялянская праўда замоўкне
двойчы месяц узыйдзе салодкі
і на векі шлях свой пакіну
па якім я вяртаўся з Слабодкі.

Загавораць тут дрэвы і лугі
бо між імі сцяжыны таптаў
калі ішоў у грыбы на даліну
усім птушкам песні спяваў

памагалі мне вецер і дрэвы
балбатаў і філосаф павук
тут жыццё самастойна вядзецца
без ніякіх вялікіх навук.

Паэзія жыцця

Жыхарам Слабодкі

Маім натхненнем гай зялёны
дрымучы вецер у садочку
настой духмяны чарамшыны
цыбуля сплецена ў вяночку

маёй дарогай блакіт вады
і пах пакошанай атавы
вось гэты шлях туды вядзе
дзе людзі не шукаюць славы

тут ціхі ранак у пялюшцы
певень апоўначы спявае
а дзед Сяргей цягнуў даказ

„жыццё нам хутка ўцякае"

З Бярнацкага Мосту

Над дрымучым гаем
сінія аблокі
вецер там загляне
босы адзінокі
скубне за галінку
соннае лазіны
пнецца ў глыб душы
шукае хвіліны
каб неспадзявана
выбегчы і знікнуць
у басейн ракі
дзе бабёр уголас плача
бо вады баіцца
як чорт Божай ласкі
і не разумее
мэты сваёй службы
асягнуўшы рост жыцця
і сямейнай дружбы

* * *

У ціхім полі на даліне
асот у пояс вырастае
і гэта дзіч-дзівота Божа
душу сялянскую кранае

ціхі світанак у далонях
поіць расою цвет духмяны
з касою поўнаю фантазіі
ідзе наранкі Васіль п'яны

скубнуў пакос адзін і другі
прысеў падумаў зажурыўся
— чаму ўнутрына іграе
відаць замала я напіўся

дастаў з-за пазухі бутэльку
прыссаўся да яе як мог
калі ўжо выпіў то паддаўся
бо ў вачах меў сем дарог

і як цяпер мне падарвацца
ляжу на сцежцы сваёй долі
заспяваю пра няшчасце
горкай сялянскае нядолі

Белыя ночы

Шлях жыцця праціралі далоні
у разведку з'явіўся „кругляк"
адбіццё ўтапіў у калюжы
цяпер блукае сам чортведзь як

Перабегла субота так хутка
што не змог палічыць усіх гадзін
так прылюдна пахне тут ліпа
і дастойны белы язмін
а пакутнік шукае прычыны
каб павесіць надзею сваю
і дзівуецца што сярод ночы
я на ганку так шчыра стаю

зразумеў мае мары дзівоты
калі ранак падняўся дзявочы
і слязою срэбнай расы
поіць часта белыя ночы

* * *

Лістапад лістапад
злосць павесіў на дрэвы
дождж абмыў летні пыл
зачыніў цёплы вырай
і рассыпалася восень
па грудзіне зямлі
вецер холадам ліжа
скуру лістам дзярэ
ў гапалкі перанёсся
на пусты сервітут
бо няма ўжо Паўла
што авечак пас тут

Падумайце

На загонах пражытых гадоў
пахла зелле — рамонак бялявы
раней сонцу кланяўся аблог
сёння дрэвы шумяць і шумяць

не шукайце дарогі ў шчасце
гэта толькі сяброўскі Давід
адусюль безупынна сплывае
захад сыты ў наш краявід

— адазвіся славянскі народзе
затанцуюць казакі ў полі
толькі праўда нас абароніць
ад еўрасаюзных сяброўскіх гастроляў

на сваім ганарышся сабою
на чужым возьмеш нізкі паклон
ну падумай — як гора з бядою
заараць у еўрапейскі загон

На Падляшшы

Не магу дамовіцца з душою
адгукнулася бракам натхнення
з гэтых вуснаў, сум загрызае
маю долю і лёс пакаленняў

усім тым, каму блізкае слова
а засеяў зерне прымусам
не падзеліш на двое душы
а пацвердзіш сябе беларусам

„Паласатая" мова жыве
заўжды там, дзе жывуць яе дзеці
каб маглі і філосафы бачыць
як парадак вядзецца ў свеце

сто гадоў баранілася навука
а паэтаў за рукі вялі
хай цяпер з паласатай правінцыі
вырастае соль гэтай зямлі

Кліч душы

* * *

Куды так хутка бяжыш
куды так уцякаеш
прысутным сённяшні дзень

маўчанне
— душы маўчанне

за бетонным крыжам
усе свае
сляды ўчарашніх гутарак
абмыў дождж

за малітваю плывуць

сінія аблокі

шуміць векавая хваіна

адплывае спакойнае неба

Кахаю...

Калі спазнаеш — адазвіся
пакліч мяне так шчыра
як умееш на голас твой
заўжды я ядгукнуся няважна
ці мяне ты зразумееш
вочы твае ўсё мне скажуць
сляды твае цябе пакажуць
не ўцякай перада мною
я ж сумленне тваё

ніводнай зоркі вырай не калыша
на хмарным небе полымя ў разьбе
гарыць надзея свечкаю кахання
пакуль не згасне міласць да цябе

прайшлі гады ў цішы маркотай
каб хоць адзін разок сучасны
так у нябыт крычыць душа
прысніся хоць — я так цябе кахаю

* * *

Ніколі не адчуеш свабоды
скрыжаваўшы рукі
на твары
паморшчанай праўды.

Ніколі не спазнаеш бяды
накрыўшы на вочы
прызму люстра

Ніколі не нацешышся жыццём
адарваўшы галінку веры
уласнай магчымасці:
свету:

— срэбная раса
— сонца дыханне

існуе жыццё

* * *

На блакітнай стужцы
калышуцца грахі
нашага сумлення

цёмная вопратка ночы
заклікае ўяўленне

касмічная музыка
ліжа агнём сонную душу
сплывае пот
слёзы пакаціліся ў горла

толькі спагада
асяроддзя
вярнула сілу душы

назаўсёды.

* * *

Зямля...
ты наша маёмасць

магутны крыж навук
распяты на душы
ласкавы век дваццаты
заснуў ужо ў калысцы,
ды ты яшчэ яго памалу калышы

відаць прагноз не быў прадмовай
час павялічыў толькі прагу,
каб цішыню развеяла навука
заклікаць вопыт слоў
жыццёвую адвагу,

мабыць не тут ляжыць прычына
жыццю віноўны: час, разлука
не цяжка ў бядзе бяду нажыць
ды гадаваць яе — сапраўды штука.

* * *

Калі ўжо хаваеш
каляндар свайго жыцця
ажывае свядомасць
пражытых гадоў

ізноў
заслужаная бяда
ідзе насустрач

у вокны
з задуманым тварам

слёзы адзіноты
размываюць унутрыну

— дыханне

за фіранкаю свабоды
чорная дарога
застыла ў вачах.

Водгукі

... і час назначыў
нам вясну
з зялёных вуснаў
льгота кліча
і вось імунны арганізм
у глыб душы маёй пранік,

там ажывае пласт асноўны
бо пульс жыцця завёў матор
ад прыгажосці травень п'яны
спыніўся зрокам у прастор

раскалыхаліся бярозы
і зашумеў магутны гай
сонца абцерла слёзы ночы
вярнуўся ўжо цвярозым

май.

* * *

Побач нас
калышуцца думкі маладосці
пад купалам неба
чыстая прастора
— адчуваю смак жыцця

цёплыя слёзы
абмываюць засохлую праўду
нашых мараў

існуе ўяўленне
кранае душу
з глыбіні выкідае
голас журбы

на гарызонце май
разліваецца
духмяным настоем.

* * *

Не раўняю сябе
да паэтаў
Бог назначыў маёмасць маю
на мяжы хвалявання свабоды
у чарзе за чужымі стаю.

побач нашых запісаных мараў
здзяйсняецца толькі адна
калі глянем
кругом зацвітае
прыгажэйшая сэрцу
вясна.

* * *

На белай паперы
Чыстая прастора жыцця
ды
змучаныя вочы
мінулых гадоў

* * *

Астаўся адзін
у гайнаўскім завулку
кругом жыццё цвіце
змагаецца душа
ды ціха
маркоціцца і вопыт
пляце начныя думкі
у вяночкі
і журбота абмывае
слёзы вокнам
калі заглядаюць

сыны і дочкі.

Самота

Дзень як штодзень
мінаюць гадзіны
а жыццё —
нам мазоль круты вяжа
нарастае балюча
свядомасць
што сапраўды старасць пакажа

у нейкі час
адарваліся мары
а без іх засыхае і прага
уцякаюць бязведна
з вачэй:
— радасць вопыт дабро і адвага.

Адляцелі і тыя гадзіны
пры якіх мой пройгрыш маўчаў
след загінуў
дзесьці ў натоўпе
хоць настойліва яго спалучаў.

Дзякую!

за дабро мацярынства
за споўнены сон
цяпло дзяцінства
вялікае дзякуй!

за любоў і ростань
за прамень сонца
свабоду жыцця
на зямлі дзявочай
вялікае дзякуй!

кветкі маладосці
цвітуць
пах
разносіцца
ў дарослыя гады

* * *

У жыцці ўжо так бывае
што і часу не хапае
каб задумацца над лёсам
ды вялікі дзень бяседы
надышоў неспадзявана
даў жыццё за перамогу
і паклікаў нас дахаты
на далейшую дарогу

хто зблудзіў таму пакута
адарвацца дапаможа
не спадзейся тут заплаты
за худыя падарожжы
бо ў жыцці ўжо так бывае
што і часу не хапае
каб лягчэй было ў жыцці
за дабро дабром плаці

Новы год

вядзе на новую дарогу
па беразе жыцця вясна збягае
гадзіны б'юцца ў грудзі ночы
урэшце „холад" адплывае

часта, ой часта паўтараем
закон вялікага прарока
— „у бядзе пазнаеш свайго друга
калі сам станеш яму слугай"

але, усё-ткі душа баліць
дык слуга ўсіх нас пераросшы
няма людзей так дасканалых
калі гаворка ідзе пра грошы

і дзе падзелася сяброўства
хто пераліў нашу свядомасць
чаму за веру гінуць дзеці
гэта ж наша маёмасць
Хто цалаваў Ірада ў рукі
пятно граху пакінуў нацыі
цяпер патомнымі ўжо сталі
шукаюць у Бога сваёй рацыі
і нарадзіўся нам Хрыстос
спагада свету, людзям надзея
і спаўняецца прарочы сон
што гэта Бог і Казнадзея

Памылка

Ад дзіцячых гадоў
адарваўся наш час
і пабег у прагон
за дарослым „хвастом"
праз калюгу бяды
плыў мой голас журбы
утапіў шмат дабра
пад драўляным мастом
ды не мне рассуджаць
хто каго і за што
ацаніў пры жыцці
чортведзь як
знаю толькі адно
трэба быць чалавекам
і прызнацца
хаця гэта не ў смак.

XXI век

Шлях жыцця на пахілых дарогах
льецца фальш і аблуда „людзей"
адплывае спагада народаў
а злачынства іграе смялей,
— падкажы мне, мой мілы сынок
хто Тваю цішыню збаламуціў
Ты ж пакутнік зусім маладой
на малітве дзяцінства павесіў! —

пацвярджаеш, што Бог
вас назначыў
здзейсніць мары на гэтай зямлі
і дзяцінства святое ў пялешы
каб натоўпу жылося лягчэй.

Маладосць! —
— ты настой белай праўды
што кладзецца на будучы цвет
каб надзея не бегла пустая
бо за праўду змагацца лягчэй.

* * *

Ніхто мяне не шкадаваў
не абціраў дзіцячых слёз
каму ў дарозе падказаў
што кропля шчасця гэта лёс

хто ў жыццё накіраваў
стварaў дыялог бягучых спраў
усім падзякаваць хачу
каму так моцна дакучаў

ой цяжка цяжка будаваў
гады любові і дабра
аднак цяпер душа баліць
за свайго роднага сябра

і не прыдумаю чагось
чаго ў жыцці б пашкадаваў
забаўкі шчасця ўжо няма
якую часта прытуляў

Жыццё вядзе мяне на шлях
маўклівых споўненых гадоў
і бачу поўнасцю сябе
ізноў я тут — ізноў ізноў

Навучайце

Паціхеньку ступай
след у след
за дабром
многа слухай а менш гавары,
калі ліхая злосць
закранае душу
то малітву якраз сатвары.
а вернеш блізкім сон
і надзею жыцця
пакажы толькі мэту дарогі,
адначасова шукай
палавінкі сябе
каб хоць мог
пастаяць перад Богам
зноў вернецца спагада
асяроддзя ўсяго
бо душа апраўдалася хворая

вось бяду зашывайце
і няхай там начуе
за палою мінулага гора.

З надзеяй...

на сон дзявочы на ўсмешку
кладзецца ночы бледны сцяг
і сніцца бой душы свабоднай
някрануты пакутай шлях,

натхні душу сваю каханнем
дазволь нацешыцца сабою
і не шукай у маіх далонях
свайго маркотнага настрою.

як нам нячаста сустракацца
любоў збліжае вязь дзявочу
душа плыве ў блакіце мараў
і сэрца б'ецца мне ахвоча,

чаго ж яшчэ да шчасця трэба
у самоце бракла цёплых слоў
жыццё кладзе на нашы рукі
надзеі дзве, што калісь зноў
сустрэнемся ў нядзелю
каб немагчымасць перажыць
спазнаць нанова сваё шчасце
цаглінку згоды палажыць.

* * *

Вечар ціхне
ажывіўся ліхтарык
на сцяне Багародзіца Маці
зрокам цісне хваробу
цяжкі пот пераліўся сілком
па спіне працягае бічамі
у вачах маіх топіцца мгла
ды з усіх сілаў маўчу

першы жальнік акрыла пакута
а астатні малітва ў Бога
— хто так шчыра мяне пакахае
апроч цябе, мая ты кароста

ой як хочацца жыць.....!
за сцяною спеў, гоман слоў
адчуваю сябе такім спакойным
як дзіцятка на іконе сноў

Восень

Халодным позіркам
рыхтавала шлях
сінякрылы вецер
шаптаў рабінам
жарт, яшчэ цёплы
— чырванелі

гарызонт калыхаў
залацістую касу сонца
— прасёлкавая дарога

я шукаў
свайго месца на цяпер
— каб пражыць
— зблудзіў з дарогі

старасць.

* * *

Бацьку

Ты чытаеш
з маіх вуснаў
гутарку душы,
нахіляешся
над ціхім вершам
а
сонная мара
заклінае гадзіну жыцця
адрываеш
мінуламу стагоддзю
вопратку існавання

самота.

* * *

На дзіцячы пацалунак
зрокам выклікана адвага
маладым паэтам вясна:

— чыстае неба
— істужка маладосці
— спагада людзям

а калі дарастаеш
зняволеная душа абымае
рыфмай любасці
вечнае каханне

прага свабоды
прадчувае журботу жыцця
а смутак паўтарае рэхам

— сірата сірата.

* * *

сяброўцы Валі Коц

Кругом цішыня
малады вецярок
пляце косы бярозам

каханая — прысядзем
сярод буйнай цішыні

з-за гаю выплыў
камандзір ночы
лічыць зоркі — дзівуецца
— прыгожа быць маладым

кахаць і быць каханым.

Павер

гадзіне, каторая нясе
натхненне
бо калі паверыш
прабудзішся

зразумееш тады
што маладосць і любоў
вядуць адзін напрамак
а любоў — кажучы
дагэтуль поўная, пакуль
у сэрцы свабода маркотная
цячэ як сляза шчасця,
што ціснецца
ў куточак мараў

так вырастае хлеб
гэтай зямлі

Суботні вечар

Плыў суботні цёплы вечар
пахла на двары
калыхаўся май даспелы
высока ўгары
пад бярозаю зялёнай
хлопец малады
абяцаў сваёй дзяўчыне
міласць назаўжды
прытуліў яе да сэрца
шчыра так як мог
прасядзелі паціхеньку
без ніякіх слоў
гэту міласць немагчыма
рассудзіць сяк-так
калі бард кахаў дзяўчыну
цвіў чырвоны мак
не змагу спыніць задумы
ў песні салаўя
шчыра табе аддаюся
міласць ты мая

Сустрэча

Яшчэ таполі зелянеюць
ды восень задзірае нос
развеяць хоча нам
размову ціхай паэзіі
што ў нябёсах
пранікла душу сярод ночы
бо мне дабрылося ў сне
якога праўда ўсіх яднае
хтосьці
чакаў там мяне
а хто — сапраўды
Бог сам ведае

У Ракітным Лузе

Олі Саўчук,
загінуўшай ад грому

Дару свой лёс Табе
— мой Божа
бо знаю што прыйшла пара
прайсці сцяжынкаю святою
як слуга да свайго цара

чакай мяне мой мілы дружа
у Ракітным Лузе красаты
дзе поплаў зелянеў духмяны
ад слёз і срэбнай яснаты

няма тут сівае асіны
ні ягад спелых буякоў
шуміць ужо лес, а край хваіны
радочкі буйных дубчакоў

пранік і дождж палу лясную
і адазвалася прырода
у Ракітным Лузе пад бярозай
ляжыць дзіця майго народа

* * *

У невялікай рыбалоўцы
вечар варажыў маланцы
што за цемраю не зможа
раздзяліць свой цень у шклянцы

разгулялася маланка
злосць накінула на плечы
хай баяцца маіх вочай
не магу раўняцца свечы

Рэформа

Цяжка жыць сягоння ў свеце
Тут аблуда ў рэйс плыве
Праўду Бог злажыў даказам
Чорна-белай галаве
Кожны хваліць сябра-друга
За вялікія падзеі
А ў балансе многа страт
Бушавалі шмат зладзеі

За падаткамі прычына
(Завязалася міжволі?)
Зноў, браток, папаўся ў рукі
Трэба гнуць спіну ў нядолі

Позна ўжо шукаць віноўных
Кожны абяцаў замнога
Рэчаіснасць нам пакажа
Дзе жыцця твайго дарога

Наш час

... ці скажаш: Божа!
— яшчэ рана, спяшаць
няма куды — дзіця я
— даруй мне грэшніку...
дазволь пакаштаваць жыцця

пакіну слёзы на зямлі
сплывуць у родны кут
за стыль жыцця маёй сям'і
астаўся як банкрут

пакінуў бацькоўскі парог
ручнік што на іконе
духмяных кветак поўны луг
і вецер у прагоне

Мой выбар

* * *

Вядуць мяне на шлях задумы
дзе ціхне голас нашай мовы
сярод крыжоў і вецер гасне
нясе жыццю пустыя словы,

з'яднала нас дабро людзей
яднае і пакута Богу
сярод сваіх знайшоў тут месца
сваю астатнюю дарогу
затым, усіх нас Бог пакліча
на суд вялікіх перамен
шкада чакаць такой хвіліны
давай пагутарым Парфен.
... ці зноў народ наш адарвецца
вялічыць гонар і адвагу
... ці ціхі год адбярэ нядолю
зайграюць думна смерць і прага.

Вядуць мяне...

Голас душы

Нечакана мушу ехаць
лёс рассеяў маіх блізкіх
занясу вам паклоны бацькоў
за якімі сумуеце моцна

тут у нас заціхае свабода
ноч пустыя гадзіны пляце
адплывае зорнае неба
страх і холад ідуць відавочна

ціхі дождж абмывае нам слёзы
пакаленне патрыётаў расце
хто ж загляне радзіме ў вочы
старасць злуе — ідзе ў адкос

дачакаліся мы — беларусы
што зняволілі нашых сыноў
баімося крыж свой паставіць
корань зла зямлю перарос

без абразы — гуляйце ва ўладу
вас разлічыць патомны народ
на мяжы хвалявання дурноты
заараліі вы свой агарод

Місія

Краю мой родны
краю мілы
змагацца сам
не маю сілы
цяжка так жыць
і быць паэтам
ды знаю што
памру за гэта

Ніхто нам
не памог падняцца
усе застрашаны
— баяцца

у якой зямлі
рассем зерне —
такім і хлебам
час паверне

Бацькаўшчына

Лёс адабраў вязь пакаленняў
падзяліў шмат людзей
паноў не стала
ды Радзіма жыве

Куды ляціш, белая лебедзь? —
вырай крычыць: — Беларусь, Беларусь,
там цішыня людзей яднае
за чысціню сваю — клянуся

світанак чысты як сляза
зрокам агорне спакойны блакіт
загляне, а Нёман дзявочы і ціхі
пейзаж гэты доўга спіць
на душы

Выбарчая ігра

Не суцешаць мяне твае словы
уцякае спагада людзей
дзе сумленне дзе людскія вочы
калі ж ты не бяздушны зладзей

ашукаў сваіх блізкіх і сябраў
выбарчай каўбасы горкі смак
разгуляўся як вецер у полі
а мне ўстыдна што я твой „сваяк"

за цябе закліналіся людзі
ксёндз маліўся за душу Паляка
астанешся як палец мезенец
як пакінуты ў лесе сабака

цябе цешыць чужая бяда
такі вывад узяўся з размовы
вывучаю сэнс тваіх слоў
— як палова! — пустыя ўсе словы
неспакойна клубуюцца мыслі
у галаве незвычайная льгота
ці паверыш, што голад душы
гэта смерць, гэта сум — адзінота
на далонях жыцця ўсе дарогі
даіграўся браток чортведзь як
падзяліў сваіх сябраў нядолі
ды сябе не падзеліш ніяк.

* * *

Уцякае наш час
з палітычных дарог
а ў сэрцы стрэмкі турботы
як змагацца за лёс
ідучы за народам
перад намі святая субота

З далёкіх лясоў
пераносім свой доўг
пах сасны яшчэ свежы
існуеш непадзельна
агалошваеш свой погляд
беларускай маладой рубяжы

Не пачуеш свабоды
калі „бацька" педант
непрыхільны на доказ народа
усю пашану людскую
размываюць вам грошы
у беларускай нацыі згода

Магутнасць мовы

Народзе беларускі
я побач — за мяжою
народную мову продкаў
на вечнасць запішу,
тут на крыжах пакуты
сляды сапраўднай мовы,
каторая начуе
у сёлах гарадах,
толькі не разумеюць
„чэрці"
чыімі яны дзецьмі,
усе мы тут у гасціне
адна ёсць нам дарога
давайце выйдзем сёння
з адвечнай ціхай волі
Пагоня распарола
душу свае нядолі,

вось толькі Ты народзе
вясну нясеш і славу
у Мінск, Брэст і Слонім
у брацкую Варшаву

і мы паклон прыносім
за мову да паэтаў
Беларусь жыве сапраўды
як край другога свету.

без слоў

У чужой калысцы
немая свабода
— калышацца голас маладосці

на ўрок гісторыі
ліхаманка папулярнасці
кліча жыхароў

цвярозым словам
пішацца гісторыя

за белымі зубамі
пакінулі слова Радзіма

свядомасць

гісторыя

Прадчуванне

Словы словы
нашай простай размовы
мае роднае мовы
заўтра сам не пачую
адляцела адвага
асталася мне прага
каб заклікаць свядомасць другую.

Тут пасеялі зерне
на засохлым балоце
і бацькоўская мова
асталася самоце,
ды славутыя людзі
яе рост павялічаць
на заяву народа
Беларусь іх пакліча

без крыві без турботы
па прыхільнасці Бога
пойдзем іх сустракаць
на памежжы дарога

Сярод сваіх

За намі багацце
пражытых гадоў
за намі маёмасць
запісаных слоў
гады маладыя бягуць
вельмі хутка
калі аглянуўся, прайшло
сорак пяць,
ды каштаваў
смак прэснага хлеба
за будучы плён
змагацца стаў
мой дом тут і кут
мая радзіма
і мовы простай звонкі гук.
тут нарадзіўся
сяк-так пражыўшы
і не прывыкну да разлук

* * *

гэта не грэх
быць беларусам...
маці вучыла і гаварыла
што пойдзем праўду абараняць
на гонар наш — пісаў Купала

— сапраўды
цяжкі лёс народа
калі сваяк няёмкі на мяжы
пакінуў плён свае турботы
— растуць гісторыі крыжы

бо хто нясе свабоду свету
таму і Божай волі шлях
на беларускай велічнасці зноў
бел-чырвона-белы сцяг

а хто нясе багацце слова
у родны кут сваёй краіны
там яго мова назаўсёды
пашанай Богу і айчыны

* * *

Мой верш
гэта ціхі голас сумлення
гэта крык свабоды — на паперы
акно ў будучыню
хаця там
немая свабода
азываецца няспынна

Верш мой
— малітваю
за няўдачы бацькоў
у Радзіме
глухіх на гісторыю
вялікую
як

суседка Расія.

Здзейсніць мары

На зямлі на сырой
распранулася ноч
сцяг блакітнай зары абарваўся
зіснаваўся наш дзень
як прымухі загар
на каторай след ночы застаўся

Адплываюць гады
у бязмежжа жыцця
азываецца голас пакут
ці вернешся сюды
дзе дзяцінства спазнаў
пакідаючы родны свой кут

А цяпер ляці свабодна
як за рэхам — спеў і гоман
то пачуюць нашы сябры
блізкі сэрцу ціхі Нёман

бач як цешацца супольна
усе людзі з Божай волі
што Пагоня ўсё ж адбіла
зло „бацькоўскае" нядолі

Рэха

Ты ляці
у свет шырокі
па загонах яшчэ свежых
сёння вяжуцца надзеі
несмяротай Белавежы

памяшалі словы праўды
з шумам рослае таполі
час пакажа хто з магнатаў
патрабуе нас у нядолі

хай пакажуць пакаленням
„Бацькаўшчыну" — яе вочы
за мяжою цяжкай праўды
Нёман ціхі і дзявочы

* * *

Цяжка жыць
на „Белай — Русі"
у вырай падняліся гусі
ціха на мяжы
Падляшша
аплывае сон
сумна стала і паэтам
усе лаюць нас за гэта
што ў радзіме
толькі Колас гаварыў
па-беларуску
ўголас
а сягоння
дзед Лукаш куе падковы
для сяброўскае аховы

Бацькаўшчына

Лёс
адабраў нашу вязь
пакаленняў падзяліў
шмат людзей і паноў
гісторыя
заўжды паўтарала
Радзіма жыве — кліча сыноў
— куды ляціш мая белая лебедзь
вырай крычыць — у Беларусь
там цішыня людзей яднае
за чысціню сваю — клянуся

світанак чысты як сляза
зрокам агорне спакойны блакіт
загляне над Нёман дзявочы і ціхі
і гэты пейзаж доўга спіць

на душы

* * *

Не накорміш бяды
не пасцелеш вады
расплываецца ў нас баламутна

хто каго і за што
лаяць мог без пары
існуе недахоп для рэкрута

Камісары „байцы"
не змаглі вас бацькі
згандлявалі рускае слова

ну прыйшла ўжо пара
на дыялог за сталом
ажыла беларуская мова

Хто не ў сіле пражыць
за мяжою разгляд
зацвітае балюча каліна

гэта погляд вясны
на жыццё беларусаў
тут малая наша айчына

Ганьба! ганьба! — усім
хто спаганіў народ
і пакіне сляды прымацкія

над усім тут жыццём
рэжым строгі вядзе
старая мачаха Р..ія.

Мы беларусы

Гісторыю слоў — яе багацце
ствараем з надзеяй, што
праўды змест пакажуць
дзеці сваім патомным
хто
мову продкаў нам адабраў
балюча слухаць слоў умоўных
хоць край над Нёмнам
беларусаў поўны
сляпая праўда моцна баліць
парадак у айчыне
гэта цэнтр асноўны
інакш прабудзішся ў самоце
напрамак Русь не па дарозе
пачуем толькі смак бяды
і ўбачым крыж пакутны на парозе

Змест

МОЙ РАЙ

Адчуваеш свабоду размовы.....3
Думка.....4
...калі бягу.....5
Успаміны.....6
У Нараўцы.....7
Ліпень.....8
Май.....9
На вадзе разбурылася ноч.....10
Паэзія жыцця.....11
З Бярнацкага Мосту.....12
У ціхім полі на даліне.....13
Белыя ночы.....14
Лістапад лістапад.....15
Падумайце.....16
На Падляшшы.....17

КЛІЧ ДУШЫ

Куды так хутка бяжыш.....18
Кахаю.....19
Ніколі не адчуеш свабоды.....20
На блакітнай стужцы.....21
Зямля.....22
Калі ўжо хаваеш.....23
Водгукі.....24
Побач нас.....25
Не раўняю сябе.....26
На белай паперы.....27
Астаўся адзін.....28
Самота.....29
Дзякую!.....30
У жыцці ўжо так бывае.....31
Новы год.....32
Памылка.....33

XXI век.....34
Ніхто мяне не шкадаваў.....35
Навучайце.....36
З надзеяй.....37
Вечар ціхне.....38
Восень.....39
Ты чытаеш.....40
На дзіцячы пацалунак.....41
Кругом цішыня.....42
Павер.....43
Суботні вечар.....44
Сустрэча.....45
У Ракітным Лузе.....46
У невялічкай рыбалоўцы.....47
Рэформа.....48
Наш час.....49

МОЙ ВЫБАР

Вядуць мяне на шлях задумы.....50
Голас душы.....51
Місія.....52
Бацькаўшчына.....53
Выбарчая ігра.....54
Уцякае наш час.....55
Магутнасць мовы.....56
без слоў.....57
Прадчуванне.....58
Сярод сваіх.....59
гэта не грэх.....60
Мой верш.....61
Здзейсніць мары.....62
Рэха.....63
Цяжка жыць.....64
Бацькаўшчына.....65
Не накорміш бяды.....66
Мы беларусы.....67